МАЙСТЭРНЯ НАСТАЎНІКА

**Т. Ю. Аброськіна**

# Факультатыўныя заняткі
# **«АСНОВЫ МОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ»**
# ў 2 класе

*Дапаможнік для настаўнікаў устаноў адукацыі,*
*якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай*
*сярэдняй адукацыі*

Мінск
«Сэр-Віт»
2025

# ПАВАЖАНЫЯ НАСТАЎНІКІ!

Прапаную вашай увазе распрацоўкі планаў-канспектаў факультатыўных заняткаў «Асновы моўнай культуры» ў 2-м класе.

Мэта – павышэнне ўзроўню маўленчай культуры малодшых школьнікаў, выхаванне і ўзбагачэнне іх індывідуальнага маўленчага вопыту, развіццё моўнай асобы.

У 2-м класе вучні працягваюць знаёміцца з прыродай Беларусі, старажытнымі гарадамі, слухаюць паданні. Пры гэтым пашыраецца слоўнікавы запас вучняў, мова ўзбагачаецца ўстойлівымі зваротамі, удасканальваецца тэхніка маўлення.

Асноўнымі метадамі навучання з'яўляюцца моўныя гульні, камунікатыўныя практыкаванні, слуханне, чытанне фальклорных і літаратурных тэкстаў, элементарны моўны аналіз тэкстаў, гутарка, завучванне на памяць невялікіх вершаў, драматызацыя і інш.

Настаўнік мае права ўносіць пэўныя карэктывы ў змест і структуру заняткаў у залежнасці ад маўленчай падрыхтаванасці вучняў, узросту і псіхалагічных асаблівасцей, сфарміраванасці моўнай культуры.

Вучэбна-метадычны комплекс уключае планы-канспекты для настаўнікаў і рабочы сшытак з заданнямі для вучняў.

Планы-канспекты дапамогуць настаўніку правесці заняткі найбольш эфектыўна; спросцяць падрыхтоўку да заняткаў і сэканомяць час; будуць асновай, якую настаўнік можа дапоўніць уласнымі, апрабаванымі прыёмамі і метадамі; дадуць магчымасць выбраць тыя прыёмы, якія падыходзяць менавіта для кожнай канкрэтнай групы вучняў.

Настаўніку вельмі важна ўважліва прааналізаваць узровень падрыхтаванасці вучняў, з якімі ён займаецца, каб не перабольшваць колькасць заданняў і не спрашчаць матэрыял. Ён можа вар'іраваць аб'ём і складанасць матэрыялу, не абавязкова даваць для ўспрымання ўсе заданні, калі гэта перавышае магчымасці вучняў. Настаўнік павінен імкнуцца, каб работа на факультатыўных занятках прыносіла вучням задавальненне, была цікавай і пасільнай.

Для рабочага сшытка падабраны багаты і разнастайны тэкставы матэрыял: частка твораў з'яўляюцца фальклорнымі, частка – аўтарскімі. Шматлікія заданні будуць садзейнічаць развіццю кемлівасці, логікі, гнуткасці мыслення, звязнай мовы вучняў, а таксама ўзбагачэн-

ню іх слоўнікавага запасу.

Яркія ілюстрацыі ў рабочым сшытку дадуць магчымасць задаволіць патрэбу вучняў у нагляднасці, будуць садзейнічаць глыбокаму разуменню моўнага матэрыялу. На працягу ўсяго года вядзецца актыўная работа са словамі, словазлучэннямі, сказамі. Многія заданні з'яўляюцца прапедэўтычнымі і даюць магчымасць на ўзроўні адчування зразумець складаныя моўныя паняцці (сказ, словазлучэнне, словаўтварэнне, корань, блізкія па значэнні словы і г. д.).

Багаты арсенал фальклорных твораў дасць магчымасць далучыцца да моўных традыцый нашых продкаў, узбагаціць інтэлектуальны запас вучняў народнымі паданнямі, легендамі, казкамі.

У рабочым сшытку ёсць дастатковая колькасць заданняў, дзе вучні могуць праявіць свае творчыя здольнасці, маляваць, расфарбоўваць, што не толькі дасць магчымасць для развіцця дробнай маторыкі кісці рукі, але і дазволіць ім адпачыць ад напружанай разумовай працы. Вельмі важна, каб вучням падабалася ўзбагачаць свой слоўнікавы запас, выказвацца на беларускай мове, уліваца ў моўную плынь.

***Жадаю поспеху вам і вашым вучням!***

## Прыкладнае
## каляндарна-тэматычнае планаванне

| №<br>п/п | Тэма заняткаў | Дата |
|---|---|---|
| | **Мой зялёна-блакітны край** | |
| 1 | Беларусь лясная | |
| 2 | У асеннім лесе | |
| 3 | Птушыныя песні | |
| 4 |Ляснымі сцяжынкамі | |
| 5 | Белавежская пушча | |
| 6 | Зубр – гаспадар Белавежскай пушчы | |
| 7 | Жывёлы беларускіх лясоў – героі беларускіх казак | |
| 8 | Жывёлы беларускіх лясоў – героі беларускіх казак | |
| | **Мой зялёна-блакітны край** | |
| 9 | Водныя прасторы Беларусі | |
| 10 | Беларусь рачная | |
| 11 | Беларусь азёрная | |
| 12 | Жывёлы рэк, азёр, балот у казках і паданнях | |
| 13 | Жывёлы рэк, азёр, балот у казках і паданнях | |
| 14 | Птушкі азёр і балот | |
| 15 | Жывёльны свет рэк і азёр: рыбы, ракі | |
| 16 | Беларускія крыніцы | |
| 17 | Абагульненне. Мой зялёна-блакітны край. Да прыроды – з любоўю і клопатам | |

| №<br>п/п | Тэма заняткаў | Дата |
|---|---|---|
| | **Старажытная Беларусь** | |
| 18 | Старажытныя часы. Плямёны: дрыгавічы, крывічы, радзімічы | |
| 19 | Жыццёвыя асновы. Агонь – крыніца жыцця | |
| 20 | Жыццёвыя асновы. Сонца, сонейка, свяці! | |
| 21 | Жыццёвыя асновы. Вада ў жыцці людзей | |
| 22 | Жыццёвыя асновы. Родная зямля | |
| 23 | Памяць пра легенды. Добрыя і злыя духі ў казках і паданнях | |
| 24 | Паселішчы Беларусі. Назвы гарадоў на карце Беларусі. Сталічныя гарады | |
| 25 | Паданні і легенды. Гербы беларускіх гарадоў | |
| 26 | Паданні і легенды. Гербы беларускіх гарадоў | |
| 27 | Абарончыя збудаванні на беларускай зямлі. Замкі і крэпасці. Іх значэнне ў старажытнасці і сучаснасці | |
| 28 | Абарончыя збудаванні на беларускай зямлі. Замкі і крэпасці. Іх значэнне ў старажытнасці і сучаснасці | |
| 29 | Міфы і легенды | |
| 30 | Асветнікі Беларусі. Ефрасіння Полацкая | |
| 31 | Асветнікі Беларусі. Кірыла Тураўскі | |
| 32 | Асветнікі Беларусі. Францыск Скарына. Значэнне ведаў у жыцці чалавека | |
| 33 | Асветнікі Беларусі. Сімяон Полацкі | |
| 34 | Абагульненне па тэме. Люблю цябе, мая Радзіма | |

# МОЙ ЗЯЛЁНА-БЛАКІТНЫ КРАЙ

## *Тэма 1.* Беларусь лясная

***Мэты:*** ствараць умовы для ўсведамлення вучнямі таго факта, што Беларусь – краіна, багатая лясамі; развіваць кемлівасць і назіральнасць; выхоўваць разуменне, што нашу лясную краіну трэба берагчы.

### Ход занятку

**I. Арганізацыйны этап**

Настаўнік стварае пазітыўны настрой з дапамогай верша:

Зноў вясёлы наш званок
Запрашае на ўрок.
Роднай беларускай мовы
Будзем спасцігаць асновы.

Станем вершы мы вучыць,
Гуляць, чытаць і гаварыць.
На занятках гэтых слаўных
Нам цікава і забаўна.

**II. Этап падрыхтоўкі да актыўнага і свядомага засваення ведаў**

Настаўнік праводзіць гутарку пра тое, якая мова з'яўляецца беларусам роднай.

– Як называюцца факультатыўныя заняткі, на якія вы сёння прыйшлі?

– На якой мове мы імкнемся размаўляць на гэтых занятках?

– Успомніце вершы, якія мы вывучылі на занятках па «Асновах моўнай культуры» ў мінулым годзе. (Вучні расказваюць 3–4 вершы або загадкі.)

Настаўнік паведамляе тэму занятку і просіць выказаць думку, пра што сёння пойдзе гутарка.

***Заданне 1*** (с. 4[1]). Настаўнік просіць вучняў адгадаць загадкі, падказка ёсць у рабочым сшытку.

---

[1] Тут і далей пададзены старонкі рабочага сшытка: Аброськіна, Т. Ю. Факультатыўныя заняткі «Асновы моўнай культуры» : 2 клас : рабочы сшытак : дапаможнік для вучняў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі / Т. Ю. Аброськіна. – Мінск : Сэр-Віт, 2025. – 88 с. : іл. – (Школьная праграма).

Семсот муляроў
Зрабілі дом без вуглоў.
*З народнага.*

З-пад мохавай сховы
Павысоўвалі хлопцы галовы.
Хто не ідзе – іх вітае,
З сабой забірае.
*У. Карызна.*

– Дзе можна ўбачыць гэтыя прадметы?

**III. Этап засваення новых ведаў**

Настаўнік паведамляе, што сёння гутарка пойдзе пра лес і яго жыхароў. Вучні павінны будуць не толькі паказаць і папоўніць свае веды пра лес, але і вывучыць верш на памяць.

***Заданне 2*** (с. 4). Настаўнік паказвае вучням карту Беларусі.
– Які колер пераважае на карце?
– Чаму мастак ужыў зялёны колер?
Настаўнік паведамляе, што 40 % тэрыторыі Беларусі заняты лясамі (гэта можна ўбачыць на дыяграме ў рабочым сшытку).

***Заданне 3*** (с. 5). Настаўнік просіць вучняў разгледзець фотаздымкі, пералічыць жывёл на іх і скласці кластар «Жывёльны свет беларускага лесу» (для гэтага трэба злучыць ілюстрацыю жывёлы са словам «лес»).
– Якая жывёла аказалася лішняй?
– Якіх яшчэ звяроў, што жывуць у беларускіх лясах, вы ведаеце?
Настаўнік прапануе апісаць жывёлу з кластара па плане (план запісаць на дошцы).

**План**

1. Памер (вялікі, сярэдні, малы).
2. Форма галавы (круглая, выцягнутая).
3. Чым пакрыта цела жывёлы (поўсць, іголкі, шчацінне)? Назваць колер.
4. Ці ёсць рогі, капыты, кіпцюры?
5. Чым харчуецца (траваедная, драпежная, змешанага тыпу харчавання)?
6. Асаблівасці паводзін.

Настаўнік (пры наяўнасці часу) можа паведаміць вучням цікавую інфармацыю.

***Словы настаўніка***

**Кабан (дзік)** – усёедная жывёла. Рацыён складаецца з раслiннасці – гэта клубні, карэнне, плады, жалуды, насенне, арэхі, ягады, грыбы; зімой – кара

дрэў, парасткі. Таксама можа ўжываць чарвякоў, малюскаў, жаб, яшчарак, змей, грызуноў, насякомых, яйкі птушак, рыбу.

**Вожык** актыўны ў начны час. Гнёзды будуе ў кустах, ямах, пячорах, норах грызуноў або ў каранях дрэў. Лінька ў звычайных вожыкаў адбываецца марудна, вясной або восенню. У сярэднім за год мяняецца толькі адна ігла з трох. Кожная іголка расце 12–18 месяцаў. Звычайныя вожыкі вельмі хутка бегаюць, умеюць плаваць і скакаць. З наступленнем замаразкаў вожыкі ўпадаюць у спячку. Гэта ўсёедная жывёла. Вожык харчуецца насякомымі, вусенямі, смаўжамі, чарвякамі, мышамі і жабамі. З раслін можа есці ягады і садавіну.

– Што было новым, чаго вы яшчэ не ведалі дагэтуль?

Настаўнік прапануе запісаць жывёл беларускага лесу, якіх яшчэ ведаюць вучні.

***Фізкультхвілінка.*** Настаўнік прапануе ўспомніць верш **Т. Мельчанкі** і рухацца ў адпаведнасці з тэкстам.

Птушак позніх караваны
Адлятаюць зноў за свет.
Восень лісцікам крамяным
Ім махае сумна ўслед.

***Заданне 4*** (с. 5). Настаўнік чытае ўрывак з апавядання **А. Бадака «Маленькі чалавек у вялікім свеце»**, а потым задае пытанні:

– З якой мэтай вы можаце пайсці ў лес з мамай і татам?

– Каму належыць лес?

Вучні чытаюць урывак напаўголасу.

– Ці любіце вы наведваць лес?

– З кім вы туды ходзіце?

– У якую пару года вам падабаецца бываць у лесе і чаму?

Далей настаўнік прапануе прачытаць урывак у парах.

– Якая галоўная думка твора? *(Да лесу трэба адносіцца беражліва.)*

– Калі лес дорыць нам столькі падарункаў?

***Заданне 5*** (с. 6). Настаўнік прапануе вучням пазнаёміцца з вершам **П. Глебкі «Лось»**.

Праводзіцца слоўнікавая работа над словамі «цырульня» і «волат» (па ілюстрацыях у рабочым сшытку). Асобна тлумачыцца слова «цыбаты».

**Цыбаты** – высокі і тонкі, звычайна даўганогі.

Настаўнік прапануе вывучыць на памяць урывак з верша **П. Глебкі «Лось»** (два слупкі). Пасля першага чытання настаўніка вучні адказваюць на пытанні:

– Што перашкаджала ласю?
– Куды ён вырашыў накіравацца?
– Чаму яму не ўдалося падстрыгчы рогі?
– Які настрой выклікаў верш і чаму?
– Што вас насмяшыла?

Настаўнік арганізуе завучванне першых двух слупкоў твора (калі дазваляе час) рознымі спосабамі: дагаворванне радка да канца, адны вучні пачынаюць радок, а другія дагаворваюць.

***Фізкультхвілінка.*** Вучні паказваюць, як лось ходзіць па лесе, як яму замінаюць рогі.

**IV. Этап замацавання новых ведаў**

***Заданне 6*** (с. 6). Настаўнік прапануе скласці пра лес прыказкі, у якіх пераблыталіся словы, і растлумачыць значэнне гэтых прыказак.

***Заданне 7*** (с. 7). Пасля вучні расфарбоўваюць лясныя расліны і расказваюць, калі іх можна ўбачыць (вясной, летам, восенню). Прагаворваюць, што агурок лішні, таму яго не трэба расфарбоўваць.

Падагульняючая гутарка:
– Колькі тэрыторыі Беларусі займае лес?
– Што новага вы даведаліся пра жывёл лесу?

Вучні паўтараюць урывак з верша **П. Глебкі «Лось»**.

Вучні ацэньваюць сваю работу з дапамогай смайлікаў.

## *Тэма 2.* У асеннім лесе

***Мэты:*** ствараць умовы для разумення прыкмет восені, якія можна заўважыць у лесе; развіваць слоўнікавы запас вучняў; выхоўваць цікавасць да роднай прыроды, бачыць яе багацце, разнастайнасць, прыгажосць.

## Ход занятку

**I. Арганізацыйны этап**

Настаўнік стварае пазітыўны настрой з дапамогай верша (гл. тэму 1).

**II. Этап падрыхтоўкі да актыўнага і свядомага засваення ведаў**

Настаўнік прапануе вучням успомніць, што цікавага яны даведаліся пра дзіка, вожыка.

Вучні паўтараюць урывак з верша **П. Глебкі «Лось»**.

**III. Этап засваення новых ведаў**

Настаўнік паведамляе тэму занятку і просіць выказаць думку, пра што сёння пойдзе гутарка.

***Заданне 1*** (с. 7). Настаўнік прапануе паслухаць верш **С. Новіка-Пяюна «Восень залатая»** і адзначыць знакам ☑ малюнак, які найбольш падыходзіць да твора.

Восень, восень залатая
Сее радасць на зямлі,
Хмарка ў сінім небе тае,
Мкнуць у вырай жураўлі.
Я іду лясною сцежкай,
Як па мяккім дыване.

Восень з ветлівай усмешкай
На спатканне выйшла мне.
Ярка, хораша прыбрала
Ўсюды дрэвы і кусты
І зямлю памалявала
Ў колер жоўта-залаты.

Настаўнік праводзіць гутарку пра тое, якую ілюстрацыю выбралі вучні і чаму.

Далей просіць уважліва яе разгледзець.

– Які лес адлюстраваны: хваёвы, лісцёвы ці змешаны? (Калі вучні не разумеюць гэтых слоў, трэба ім растлумачыць, каб атрымаць правільны адказ.)

***Заданне 2*** (с. 8). Вучні складаюць кластар «Дрэвы і кусты беларускага лесу», адначасова знаёмяцца са знешнім выглядам дрэў змешанага лесу.

– Якая расліна, на вашу думку, лішняя? *(Бэз.)* Чаму?
– Гэта дрэва або куст?
– Чым адрозніваюцца кусты ад дрэў? *(Колькасцю ствалоў.)*
– Назавіце лісцёвыя дрэвы, хваёвыя дрэвы, кусты.
– Якую карысць людзям прыносяць дрэвы і кусты?

***Фізкультхвілінка.*** Настаўнік чытае верш **М. Пазнякова «Арабіна»**. Вучні імітуюць дзеянні дожджыка, сонца, гронак рабіны.

Вымыў арабіну дожджык звонкі
І падаўся спачываць.
Выйшла сонца – на галінах ягад гронкі
Завушніцамі гараць.

***Заданне 3*** (с. 8, 9). Знаёмства з казкай **М. Даніленкі «Восень шыла сарафан»**.

Настаўнік перад чытаннем прапануе ўспомніць, што абазначаюць словы «гронка» і «пацеркі». Гэтыя словы вывучаліся ў мінулым годзе.

– Запомніце і адзначце на каляровым радку, якія колеры ўзяла восень для свайго ўбору.

Настаўнік чытае тэкст, вучні выконваюць заданне. Калі гэта зрабіць цяжка, то яны могуць перачытаць твор яшчэ раз.

Потым вучні чытаюць казку самі сабе і адказваюць на пытанні настаўніка:

– Якія словы дапамагаюць аўтару ўявіць восень жывой істотай?
– Якой яна вам уяўляецца?
– Што вырашыла зрабіць восень?
– Дзе яна шукала сабе ўбор?
– Якія ўпрыгожанні яна ўзяла для свайго ўбору? (Каб адказаць на гэтае пытанне, вучням трэба дапісаць пад ілюстрацыямі склады, якіх не хапае.)

**IV. Этап замацавання новых ведаў**

Настаўнік высвятляе, якое заданне найбольш спадабалася вучням.
– Пра якую пару года гаварылі сёння на занятках?
– Якія дрэвы растуць у хваёвым, лісцёвым, змешаным лесе?
– Якія змены адбыліся ў жыцці жывёл восенню?

***Заданне 4*** (с. 10). Настаўнік прапануе вучням расфарбаваць Восень-прыгажуню, дабавіўшы тыя ўпрыгожанні, якія яна для сябе выбрала.

Вучні ацэньваюць сваю работу з дапамогай смайлікаў.

## *Тэма 3.* Птушыныя песні

***Мэты:*** ствараць умовы для пашырэння ведаў вучняў пра птушак беларускага лесу; папаўняць слоўнікавы запас вучняў, развіваць звязную мову; выхоўваць любоў да птушак.

### Ход занятку

**I. Арганізацыйны этап**

Настаўнік стварае пазітыўны настрой з дапамогай верша (гл. тэму 1).

**II. Этап падрыхтоўкі да актыўнага і свядомага засваення ведаў**

Настаўнік просіць вучняў успомніць, пра якую пару года гаварылі на мінулых занятках.

– Якія колеры для свайго ўбору падабрала Восень?

– Якімі прадметамі яна ўпрыгожыла свой сарафан?

Праводзіцца гульня «Перакладчыкі». (Трэба перакласці словы «пацеркі», «гронкі», «завушніцы».)

**III. Этап засваення новых ведаў**

Настаўнік запытвае ў вучняў, пра што, на іх думку, яны сёння даведаюцца.

***Заданне 1*** (с. 10). Настаўнік прапануе адгадаць дзве загадкі **М. Пазнякова** і адказаць, як спяваюць гэтыя птушкі.

Дзве літары ўмее вымаўляць,
А можа імі нас зачараваць.

Спіць удзень яна,
Бо не бачаць вочы,
Налятаецца спаўна,
Пашчыруе ўночы.

Вучні знаходзяць птушак на ілюстрацыях у рабочым сшытку і запісваюць, як яны спяваюць.

***Заданне 2*** (с. 11). Настаўнік прапануе вучням паслухаць беларускую народную казку **«Пра што кукуе зязюля»** і адказаць на пытанні:

– З кім даўным-даўно жыла зязюля?

– Што згубілі дзеці зязюлі?

# ЗМЕСТ

Паважаныя настаўнікі! .................... 3
Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне .................... 5

## МОЙ ЗЯЛЁНА-БЛАКІТНЫ КРАЙ

Тэма 1. Беларусь лясная .................... 7
Тэма 2. У асеннім лесе .................... 10
Тэма 3. Птушыныя песні .................... 13
Тэма 4.Ляснымі сцяжынкамі .................... 15
Тэма 5. Белавежская пушча.................... 18
Тэма 6. Зубр – гаспадар Белавежскай пушчы.................... 21
Тэма 7. Жывёлы беларускіх лясоў – героі беларускіх казак .................... 24
Тэма 8. Жывёлы беларускіх лясоў – героі беларускіх казак .................... 26

## МОЙ ЗЯЛЁНА-БЛАКІТНЫ КРАЙ

Тэма 9. Водныя прасторы Беларусі .................... 30
Тэма 10. Беларусь рачная .................... 32
Тэма 11. Беларусь азёрная .................... 35
Тэма 12. Жывёлы рэк, азёр, балот у казках і паданнях .................... 38
Тэма 13. Жывёлы рэк, азёр, балот у казках і паданнях .................... 41
Тэма 14. Птушкі азёр і балот .................... 44
Тэма 15. Жывёльны свет рэк і азёр: рыбы, ракі .................... 47
Тэма 16. Беларускія крыніцы .................... 50
Тэма 17. Абагульненне. Мой зялёна-блакітны край. Да прыроды – з любоўю і клопатам .................... 54

## СТАРАЖЫТНАЯ БЕЛАРУСЬ

Тэма 18. Старажытныя часы. Плямёны: дрыгавічы, крывічы, радзімічы .................... 56
Тэма 19. Жыццёвыя асновы. Агонь – крыніца жыцця .................... 58
Тэма 20. Жыццёвыя асновы. Сонца, сонейка, свяці! .................... 61
Тэма 21. Жыццёвыя асновы. Вада ў жыцці людзей .................... 63
Тэма 22. Жыццёвыя асновы. Родная зямля .................... 65
Тэма 23. Памяць пра легенды. Добрыя і злыя духі ў казках і паданнях 67
Тэма 24. Паселішчы Беларусі. Назвы гарадоў на карце Беларусі. Сталічныя гарады .................... 70
Тэма 25. Паданні і легенды. Гербы беларускіх гарадоў .................... 72
Тэма 26. Паданні і легенды. Гербы беларускіх гарадоў .................... 75

Тэма 27. Абарончыя збудаванні на беларускай зямлі. Замкі і крэпасці. Іх значэнне ў старажытнасці і сучаснасці ........ 77
Тэма 28. Абарончыя збудаванні на беларускай зямлі. Замкі і крэпасці. Іх значэнне ў старажытнасці і сучаснасці ........ 80
Тэма 29. Міфы і легенды ........ 84
Тэма 30. Асветнікі Беларусі. Ефрасіння Полацкая ........ 86
Тэма 31. Асветнікі Беларусі. Кірыла Тураўскі ........ 90
Тэма 32. Асветнікі Беларусі. Францыск Скарына. Значэнне ведаў у жыцці чалавека ........ 93
Тэма 33. Асветнікі Беларусі. Сімяон Полацкі ........ 96
Тэма 34. Абагульненне па тэме. Люблю цябе, мая Радзіма ........ 98

Спіс выкарыстаных крыніц ........ 101